# ПЕРАДНАВАГОДНІЯ КАЗАЧНЫЯ ВАНДРОЎКІ

**14 снежня 2023 года ў Гродзенскай гарадской гімназіі імя А. Дубко адбылася творчая сустрэча дзіцячай пісьменніцы Ганны Іосіфаўны Скаржынскай-Савіцкай з вучнямі трэціх класаў.**

Мерапрыемства атрымалася цікавае і карыснае. Вучні сустрэлі пісьменніцу яе вершамі. Інсцэніравалі казку “Лепш сто сяброў, чым сто рублёў”. Затым падзяліліся сваімі ўласнымі вершамі. Яны аказаліся разнастайнымі па тэматыцы. Фантазіі ў дзяцей невычэрпныя.

Ганна Іосіфаўна пазнаёміла вучняў са сваімі новымі кнігамі, пачытала вершы пра зіму, Новы год, загадала загадкі. Адказала на пытанні, якія цікавілі дзяцей.

Затым пісьменніца з вучнямі вандравалі па старонках яе казкі “Как ребята Деда Мороза спасали”. Разам з галоўнымі  героямі твора вучні шукалі Дзеда Мароза. Яны пасябравалі з жыхарамі Белавежскай пушчы, таму што падзеі адбываюцца ў маёнтку беларускага Дзеда Мароза. Самыя адважныя змагаліся з ворагамі. Вядома, што дабрыня заўсёды перамагае злосць, так і ў казцы Ганны Скаржынскай. Менавіта добрыя, “чароўныя словы” разбурылі намеры злога ваўка-главара, ператварылі яго ў сябра, які разам з Дзедам Марозам, гасцямі і дзецьмі-выратавальнікамі сустрэў Новы год у Дзедавым маёнтку. А вучні гімназіі ведаюць многа “чароўных слоў”, і гэта вельмі парадавала пісьменніцу, настаўнікаў і бабулю Людмілу Канстанцінаўну, якая і арганізавала мерапрыемства для трэцякласнікаў і свайго ўнука Ягора.

У канцы мерапрыемства класы атрымалі паштоўкі з вершам “Матулі” Ганны Скаржынскай, з пажаданнямі ад аўтара, а бібліятэка папоўнілася кнігамі “А ў нас – зорны час” для пазакласнага чытання.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
Гродзенскае абласное аддзяленне

**На фота:** творчая сустрэча дзіцячай пісьменніцы Ганны Іосіфаўны Скаржынскай-Савіцкай з юнымі чытачамі. Гродзенская гарадская гімназія імя А. Дубко. 14 снежня 2023 года.



*Інсцэніроўка казкі “Лепш сто сяброў, чым сто рублёў”*



*Ганна Скаржынская дзеліцца сваімі навінкамі…*



*Вадроўка па старонках казкі “Как ребята Деда Мороза спасали”*



*Пісьменніца з Людмілай Канстанцінаўнай і яе ўнікам Ягорам*




*Малюнкі вучняў да твораў пісьменніцы*



*З настаўнікамі і вучнямі*



*З Людмілай Канстанцінаўнай і вучнямі*